# § 48. Развіццё навуковых ведаў і адукацыі ў Беларусі

ІЛЬЯ КАПІЕВІЧ АСВЕТНІЦТВА
КАЗІМІР ЛЫШЧЫНСКІ
СІМЯОН ПОЛАЦКІ
КАЗІМІР СЕМЯНОВІЧ
ЭДУКАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ
МАРЦІН ПАЧОБУТ-АДЛЯНІЦКІ
ВІЛЕНСКАЯ АКАДЭМІЯ

**Пратэстанцкія навучальныя ўстановы**

**1. Сістэма адукацыі ў XVI—XVII стст. Віленская езуіцкая акадэмія.** Адметнай асаблівасцю Усходняй Еўропы XVI–XVII стст. было спалучэнне шматэтнічнасці і поліканфесійнасці. Заслуга дзеячаў Адраджэння і Рэфармацыі палягала ў тым, што яны абвясцілі і пачалі ажыццяўляць шырокую праграму выхавання грамадства. Напрыканцы XVI ст. у ВКЛ налічвалася каля 300 пачатковых пратэстанцкіх школ. Мікалай Радзівіл Чорны бачыў у іх галоўны інструмент выхавання моладзі ў духу пратэстантызму. Настаўнікамі ў гэтых кальвініскіх школах былі пастары, прапаведнікі і іншыя прадстаўнікі духоўнага саслоўя. Так, у школе ў Вільні настаўнікам быў Марцін Чаховіч, у Нясвіжы — Лаўрэнцій Крышкоўскі, у Клецку — Сымон Будны. Апроч пачатковых школ у Брэсце, Нясвіжы, Вільні і іншых гарадах было арганізавана некалькі школ больш высокага ўзроўню (накшталт гімназій).

**Калегіумы ордэна езуітаў**

У другой палове XVI ст. езуіты таксама засяродзілі сваю дзейнасць на развіцці сістэмы адукацыі. Іх работа па навучанні моладзі была накіраваная на выхаванне прыхільнікаў каталіцызму. Асаблівая ўвага надавалася развіццю ўмення весці дыспуты.

Стратэгія езуітаў заключалася ў адкрыцці навучальных устаноў там, дзе назіраўся найбольшы ўплыў пратэстантаў. Ад канца XVI ст. яны таксама пачалі ствараць навучальныя ўстановы ў рэгіёнах з пераважна праваслаўным насельніцтвам. Прывабнасць добра арганізаваных езуіцкіх калегіумаў павялічвалася дзякуючы бясплатнаму навучанню хлопчыкаў з бедных сем'яў, якое забяспечвалася за кошт дакладна спланаванага збору ахвяраванняў ад шляхты і магнатаў. Не толькі каталікі, але і пратэстанты, і праваслаўныя адпраўлялі сваіх дзяцей на навучанне ў езуіцкія калегіумы.

Успомніца, як звязаны Пётр Скарга з падпісаннем Брэсцкай царкоўнай уніі.

Якую ролю адыграла Віленская езуіцкая акадэмія ў культурным і навуковым жыцці Беларусі?

У 1570 г. у сталіцы Вялікага Княства Літоўскага быў заснаваны езуіцкі калегіум, у 1579 г. пераўтвораны ў Віленскую акадэмію. Рэктарам зрабіўся Пётр Скарга, якога сучаснікі называлі «польскім Цыцэронам». Акадэмія атрымала прывілеі, аналагічныя тым, якімі валодаў Падуанскі ўніверсітэт. Згодна з граматай караля Стэфана Баторыя навучальная ўстанова стваралася для таго, каб юнакі «маглі атрымаць добрыя веды і каталіцкую веру». Дзейнасць езуітаў дала свой плён: многія феадалы ВКЛ адмовіліся ад пратэстантызму і прынялі каталіцтва.

## Школы ўніяцкай царквы

Пад апекай ордэна базыльянаў дзейнічалі навучальныя ўстановы ўніяцкай царквы. У іх дзяцей навучалі на роднай мове. Гэтыя школы цалкам запазычылі ў езуітаў сістэму арганізацыі адукацыі, а таксама змест і метады навучання.

## Брацкія школы

У адказ на пашырэнне каталіцтва на тэрыторыі Беларусі пачалі ўзнікаць праваслаўныя царкоўныя брацтвы, якія адыгралі значную ролю ў развіцці адукацыі. Брацкія школы былі ўсесаслоўныя, плата за навучанне залежала ад узроўню дабрабыту сям'і. Асаблівая ўвага надавалася вывучэнню царкоўнаславянскай мовы, якая разглядалася як сродак супрацьдзеяння каталіцтву.

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ Ў XVI–XVII стст.

| Пратэстанцкія | Каталіцкія | Уніяцкія | Праваслаўныя |
|---|---|---|---|
| • кальвінісцкія школы і гімназіі;<br>• арыянскія школы | • калегіумы (школы) пры каталіцкіх ордэнах;<br>• Віленская езуіцкая акадэмія | • школы пад апекай ордэна базыльянаў | • школы пры праваслаўных брацтвах |

Як вы лічыце, чаму ўсе канфесіі надавалі вялікую ўвагу навучанню і выхаванню дзяцей?

**Выхадцы з Беларусі ва ўніверсітэтах Еўропы**

Частка беларускай моладзі атрымлівала вышэйшую адукацыю ў іншых краінах Еўропы. Сярод іх — ураджэнец Полацка Францыск Скарына, хрысціянін верою, гуманіст па перакананнях і вучоны-энцыклапедыст па светапоглядзе. Пасля навучання ў Кракаўскім універсітэце ён атрымаў ступень «доктара медыцыны і медыцынскіх навук» у Падуанскім універсітэце. Паводле некаторых звестак, у другой палове XVI — першай палове XVII ст. каля 500 выхадцаў з Беларусі і Літвы адправіліся вучыцца ва ўніверсітэты краін Заходняй Еўропы. Сымон Будны, вядомы дзеяч рэфармацыйнага руху ў ВКЛ, скончыў Кракаўскі ўніверсітэт. Андрэй Волан атрымаў адукацыю ва ўніверсітэтах Франкфурта-на-Одары і Кёнігсберга. Многія прадстаўнікі багатых шляхецкіх і магнацкіх родаў мелі дзве, а часам і тры вышэйшыя адукацыі, што сведчыць пра высокі прэстыж навучання.

**Гуманістычныя ідэі**

**2. Грамадска-палітычная думка XVI—XVII стст. Сімяон Полацкі.** У гісторыі духоўнай культуры Беларусі канец XVI — XVII ст. — гэта перыяд позняга Адраджэння, Контррэфармацыі. На змену рэнесансна-гуманістычнай філасофіі прыходзіць абноўленая схаластыка. Аднак яшчэ некаторы час гуманістычныя

ідэі працягваюць уплываць на грамадска-палітычную думку.

Андрэй Волан — палітычны дзеяч ВКЛ, філосаф, прапаведнік кальвінізму. У адной са сваіх позніх работ «Пра гаспадара і яго асабістую дабрачыннасць» сцвярджаў, што найважнейшымі інтэлектуальнымі і маральнымі якасцямі павінны быць мудрасць, стрыманасць, справядлівасць, мужнасць і літасць. Ён ухваляў веды і навуку, адзначаў іх вялікую ролю ў грамадскім і палітычным жыцці.

**Сімяон Полацкі**

Выключнае месца ў грамадскім і палітычным жыцці XVII ст. займаў Сімяон Полацкі, вядомы не толькі сваімі літаратурнымі і публіцыстычнымі творамі, але і як бліскучы аратар і багаслоў.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Сімяон Полацкі (сапраўднае імя — Самуіл Гаўрылавіч Пятроўскі-Сітніяновіч) вядомы як паэт, што пісаў на старабеларускай, польскай і лацінскай мовах. Валодаў энцыклапедычнымі ведамі ў галіне філасофіі, гісторыі і антычнай літаратуры. У 1980 г. ЮНЕСКА ўключыла яго імя ў каляндар памятных дат арганізацыі.

*1. У якой брацкай школе выкладаў Сімяон Полацкі?*
*2. Дзе ўсталяваны прадстаўлены помнік?*
*3. Якія элементы кампазіцыі выкарыстоўвалі аўтары, каб падкрэсліць характар дзейнасці гістарычнай асобы?*
*4. Чаму Сімяона Полацкага лічаць вялікім дзеячам Беларусі і Расіі?*



*Помнік Сімяону Полацкаму. Скульптар А. Фінскі, архітэктары Г. Фёдараў і Н. Цавік. 2003 г.*

Прапаведніцкая дзейнасць Сімяона Полацкага адлюстравана ў двух зборніках — «Абед душэўны» і «Вячэра душэўная», якія былі выдадзены ўжо пасля яго смерці. Ён адыграў пэўную ролю ў падрыхтоўцы грамадскай свядомасці Расіі да ўспрыняцця пятроўскіх рэформаў. Быў прыдворным паэтам і настаўнікам дзяцей цара Аляксея Міхайлавіча, якіх навучаў у тым ліку замежным мовам і латыні. Тры ключавыя ідэі, выказаныя Сімяонам Полацкім, заключаюцца ў наступным: чалавечая годнасць вызначаецца не паходжаннем, а інтэлектуальнымі і маральнымі грамадзянскімі вартасцямі; словы абавязкова павінны пацвярджацца справамі; мэта свецкага жыцця чалавека — служэнне агульнаму дабру і вырашэнне надзённых грамадскіх і дзяржаўных задач.

**3. Эпоха Асветніцтва на тэрыторыі Беларусі. Рэформы Эдукацыйнай камісіі.** Пад уплывам заходнееўрапейскіх ідэй у другой палове XVIII ст. у Беларусі пашырыліся ідэі Асветніцтва. Праваднікамі перадавой ідэалогіі выступілі прагрэсіўныя колы шляхты і духавенства. Аднак рух не атрымаў шырокага развіцця з прычыны адсутнасці галоўнай рухальнай сілы — буржуазіі.

Успомніце, што такое Асветніцтва. Назавіце асноўныя ідэі дзеячаў Асветніцтва.

**Рух фізіякратаў**

Своеасаблівай рэакцыяй на буржуазныя рэвалюцыі ў Заходняй Еўропе быў рух фізіякратаў. Навуковыя дасягненні XVIII ст. спарадзілі веру ў тое, што веды пра прыроду, дапоўненыя ведамі пра мараль, створаць глебу для значных пераўтварэнняў дзяржаўнага, прававога і сацыяльнага характару. Фізіякраты прызнавалі зямлю і сельскую гаспадарку адзінай крыніцай багацця, а сельскагаспадарчую працу — адзінай прадукцыйнай працай. Ідэалогія фізіякратызму амаль цалкам парывала з хрысціянскай карцінай свету і тлумачыла існаванне навакольнай рэчаіснасці не боскай гармоніяй, а дзеяннем натуральных законаў.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

1. *Што фізіякраты лічылі багаццем?*
2. *Канцлер ВКЛ Яўхім Храптовіч — адзін з першых, хто зрабіў спробу рэфармаваць сельскую гаспадарку ў духу фізіякратызму. Даведайцеся, якія змены прадугледжвалі яго новаўвядзенні.*
3. *Растлумачце, чаму на патрабаванне караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў Гродне была заснаваная пасада газетнага цэнзара.*
4. *Антоній Тызенгаўз — аўтар эканамічных, аграрных, культурных рэформаў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII ст. Ахарактарызуйце яго праекты.*
5. *Ці адпавядалі погляды Яўхіма Храптовіча і Антонія Тызенгаўза ідэям Асветніцтва? Абгрунтуйце свой пункт погляду.*



*Яўхім Храптовіч. 1809 г.*



*Антоній Тызенгаўз. 1850 г.*

### Эдукацыйная камісія

Чым была выклікана неабходнасць рэфармавання сістэмы адукацыі ў Рэчы Паспалітай?

На сойме 1773 г. была заснавана Камісія па нацыянальнай адукацыі, якая атрымала назву Эдукацыйная камісія. Яна была першым у свеце міністэрствам адукацыі, дзяржаўным органам, закліканым адкрываць навучальныя ўстановы, заказваць напісанне падручнікаў і набіраць настаўнікаў. Прыняты адзіны для ўсіх школ Рэчы Паспалітай Статут выкла-

## ВЫНІКІ РЭФОРМЫ АДУКАЦЫІ

- Навучанне на польскай мове
- Свецкі характар
- Даступнасць
- Стварэнне школ трох ступеняў: пачатковая, сярэдняя і вышэйшая

дання ставіў перад настаўнікамі задачу намагацца, каб іх вучні дасягалі поспехаў шляхам разважанняў, а не шляхам механічнага запамінання. Камісія рэфармавала сістэму пачатковай, сярэдняй і вышэйшай адукацыі, надала ёй свецкі характар, зацвердзіла выкладанне на польскай мове, што спрыяла паланізацыі насельніцтва. На тэрыторыі Беларусі было адкрыта каля 200 пачатковых і 20 сярэдніх школ, а Віленская езуіцкая акадэмія была пераўтворана ў Галоўную школу ВКЛ.

**4. Развіццё навуковых ведаў у XVII—XVIII стст.** Адным з выдатных прадстаўнікоў навукі XVII ст. з'яўляецца Казімір Семяновіч. Упершыню ў Еўропе ён сістэматызаваў і апісаў прылады і апараты ў галіне протаракетнай тэхнікі і артылерыі. Свае ідэі і адкрыцці К. Семяновіч выклаў у працы «Вялікае мастацтва артылерыі», апублікаванай на лацінскай мове ў Амстэрдаме ў 1650 г. Кніга неаднаразова перавыдавалася на французскай, нямецкай, англійскай і іншых еўрапейскіх мовах. Існуюць сведчанні, што па кнізе нашага земляка вучыўся Ісак Ньютан, шматразова карыстаўся ёю і Напалеон Банапарт.

Казімір Семяновіч

Сярод навуковых прац (усяго іх каля 40) Альберта Каяловіча асаблівае месца займае «Гісторыя Літвы». У ёй расказваецца пра дзейнасць літоўска-беларускіх князёў, палкаводцаў і буйны́х феадалаў — Радзівілаў, Хадкевічаў, Сапег і інш.

Альберт Каяловіч



Тытульны аркуш «Гісторыі Літвы». 1650 г.



Малюнак з кнігі «Вялікае мастацтва артылерыі» К. Семяновіча, які паказвае канструкцыю ракет

**Жыгімонт Лаўксмін**

Філосаф, тэолаг і пісьменнік Жыгімонт Лаўксмін пакінуў значны след у развіцці гуманітарнай навукі. Яго твор «Практычнае красамоўства, або Правілы рытарычнага мастацтва» выкарыстоўваўся ў якасці навучальнага дапаможніка ў шэрагу школ Еўропы. На думку Ж. Лаўксміна, сэнс інтэлектуальнай дзейнасці заключаецца ў імкненні чалавека вырашыць галоўную праблему свайго існавання — праблему шчасця. Без ведаў, сцвярджае філосаф, чалавек не можа здабыць сапраўднага шчасця.

Ці згодныя вы з пунктам погляду філосафа Ж. Лаўксміна? Сваю думку аргументуйце.

**Ілья Капіевіч**

На мяжы XVII–XVIII стст. ажыццяўляў сваю дзейнасць наш суайчыннік Ілья Капіевіч. Па даручэнні рускага цара Пятра I менш чым за 10 гадоў ён пераклаў або склаў каля 30 кніг, многія з якіх былі надрукаваны ў яго тыпаграфіі. Кніга беларускага асветніка па мараплаўстве служыла падручнікам па навігацыі для маракоў Чарнаморскага

флоту да канца XVIII ст. Несумненная заслуга І. Капіевіча — удасканаленне кірылічнай азбукі. У тыпаграфіі Капіевіча быў адліты новы кірылічны шрыфт, які адрозніваўся ад царкоўнаславянскага спалучэннем асобных літар. Лічыцца, што менавіта шрыфт, распрацаваны І. Капіевічам, лёг у аснову новага рускага грамадзянскага шрыфта, уведзенага ў 1708 г., і па цяпер служыць асновай для азбук рускай, беларускай, балгарскай, украінскай, македонскай і іншых славянскіх моў.

**Георгій Каніскі**

Яскравым прадстаўніком навуковай і філасофскай думкі Беларусі і Украіны XVIII ст. быў Георгій Каніскі, прафесар, а пасля рэктар Кіеўска-Магілянскай акадэміі. Ён увайшоў у гісторыю як барацьбіт супраць каталіцызму і уніі. У 1993 г. архіепіскап Г. Каніскі быў кананізаваны праваслаўнай царквой (прылічаны да ліку святых). Найбольш значны след у гісторыі царквы пакінула служэнне Г. Каніскага ў сане архіепіскапа ў Магілёве ў самы цяжкі для праваслаўнага насельніцтва Беларусі час, калі ўлады Рэчы Паспалітай вялі барацьбу супраць праваслаўя.

**Марцін Пачобут-Адляніцкі**

У XVIII ст. пад уплывам эпохі Асветніцтва ў Заходняй Еўропе бурна развіваюцца матэматыка і фізіка. Навуковыя адкрыцці і вынаходствы здолелі растлумачыць сутнасць з'яў прыроды, змянілі ўяўленні людзей пра свет. У навуковых колах было добра вядома імя вучонага-прыродазнаўцы Марціна Пачобута-Адляніцкага. Выхаванец Гродзенскага езуіцкага калегіума і Віленскай акадэміі, ён працягнуў сваю адукацыю ў Пражскім універсітэце і еўрапейскіх астранамічных абсерваторыях. М. Пачобут-Адляніцкі зрабіўся дырэктарам Віленскай абсерваторыі, адной з найстарэйшых ва Усходняй Еўропе, заснаванай у 1753 г. Пазней ён узначаліў Галоўную школу ВКЛ, былую Віленскую акадэмію.

Якія ідэі ў навуковым асяроддзі прасоўвалі прадстаўнікі Асветніцтва?

*У XVI–XVIII стст. значна вырас прэстыж адукацыі, актывізавалася навуковая дзейнасць. Вучоныя, ураджэнцы Беларусі, вывучалі і выкарыстоўвалі дасягненні сваіх еўрапейскіх калег, паглыблялі і дапаўнялі іх. Імёны нашых суайчыннікаў сталі вядомыя ўсяму свету.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
|---|---|
| XVIII ст. — эпоха Асветніцтва ў краінах Еўропы | 1773 г. — стварэнне Эдукацыйнай камісіі — першага ў Еўропе міністэрства адукацыі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія вучэбныя ўстановы дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVII стст.?
2. Ахарактарызуйце дзейнасць Эдукацыйнай камісіі. Якія змены ў сістэме адукацыі, уведзеныя ёю, былі, на вашу думку, самыя важныя? Якія недахопы ў яе дзейнасці вы бачыце? Сваё меркаванне аргументуйце.
3. Ахарактарызуйце асаблівасці эпохі Асветніцтва на тэрыторыі Беларусі.
4. Выкарыстоўваючы матэрыял параграфа, стварыце постар «Навуковыя дасягненні XVI–XVIII стст.».
5. Якія ідэі грамадскіх дзеячаў XVI–XVIII стст. пра чалавека і яго якасці актуальныя і сёння?